# Апавяданне В. Быкава «Незагойная рана»

Псіхалагічнае майстэрства пісьменніка ў паказе характараў і абставін

**Л. М. Раманцэвіч,**

настаўнік беларускай мовы і літаратуры

СШ № 13 г. Ліды

**Тэма ўрока:** “Псіхалагічнае майстэрства пісьменніка ў паказе характараў і абставін. В. Быкаў. Апавяданне “Незагойная рана” (7 клас).

**Мэты:** ствараць умовы і сітуацыі для:

- узнаўлення ведаў пра Васіля Быкава;
- раскрыцця душэўнана стану маці, якая чакае з вайны сына;
- вызначэння ролі бытавых дэталяў, успамінаў, эпізадычных вобразаў апавядання (пісьманосца, суседкі Ульяны, хлопца на малатарні);
- вызначэння ролі пейзажу ў раскрыцці настрояў, перажыванняў старой Тэклі;
- развіцця ўменне вылучаць неабходныя эпізоды і складаць план;
- развіцця звязнай мовы вучняў, умення разважаць, даваць самастойную ацэнку героям і падзеям;
- выхавання ў дзяцей высокай маральнай годнасці за дзейнасць вядомых постацей Беларусі, павагі і цікавасці да прадстаўнікоў творчых прафесій.

## Ход урока

**1.Арганізацыйны этап.**

**2.Уступнае слова настаўніка.**

-Сённяшні ўрок я пачну словамі народнай мудрасці: “З майстэрствам людзі не нараджаюцца, але здабытым майстэрствам ганарацца”.

Тэма сённяшняга ўрока звязана з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны. Беларусь, як ні адна краіна свету, зведала жахі апошняй вайны. Па ўсёй яе тэрыторыі, амаль у кожнай вёсцы нагадваюць аб перажытым помнікі, мемарыялы, сціплыя абеліскі.

Прыгадайце сусветна вядомыя помнікі абаронцам Радзімы і ахвярам вайны, якія знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі. (*Курган Славы, Брэсцкая крэпасць і інш.*) Так ушанавалі ўдзячныя нашчадкі гераічны подзвіг народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Але ёсць яшчэ адна

магчымасць, каб выказаць героям сваё захапленне і ўдзячнасць – гэта расказаць пра іх.

Кнігі жывуць да таго часу, пакуль іх не толькі чытаюць, але і перачытваюць. Сёння мы прачытаем кнігу, створаную сваімі рукамі, і назавём яе “Памяць і напамінак”.

**3.Агучванне тэмы ўрока. Фармуліраванне мэты ўрока.**

-Запішыце тэму ўрока ў сшытку.

Сфармулюйце мэту ўрока, пачніце словам “раскрыць”.

**4.Праца па тэме ўрока.**

-Першая старонка нашай кнігі – “Апавяданне “Незагойная рана” В.Быкава”.

Апошнім часам я вельмі часта чую ад вучняў ды і ад дарослых людзей, што вырашэнне важных пытанняў – гэта не наша справа, што не патрэбна кожнаму ведаць сваю гісторыю, сваіх землякоў. Апавяданне прымушае паразважаць над пытаннямі доўгу, свайго месца ў жыцці. Сам В.Быкаў гаварыў так: “Расказваю пра вайну, бо ненавіджу яе”.

Апавяданне “Незагойная рана” было напісана ў 1957 годзе. У чым актуальнасць апавядання цяпер? Адказ на гэта пытанне мы будзем шукаць на ўроку.

-Ці зразумелі вы сэнс слова “незагойная”? Пра якую рану гаворыцца ў тэксце? Прамы ці пераносны сэнс мае гэта назва?

**Слоўнікавая работа.**

-Якія яшчэ незразумелыя словы сустрэліся ў творы? (*золь, фурманка, малатарня, дол, абшары*)

-А цяпер я прапаную ўявіць сябе ў ролі сцэнарыстаў і рэжысёраў. Хто такія сцэнарысты? Рэжысёры? Знайдзіце тлумачэнні гэтых слоў у слоўніку.

-Якія эпізоды найбольш запамінальныя вы выбралі б для сцэны? (*Адказы вучняў*) Адсюль зробім вывад, на колькі лагічна завершаных частак можна падзяліць апавяданне?

-Наступны этап нашай работы – праца над кожнай часткай. У час гэтай работы паспрабуем аднавіць у памяці тэкст, даць загалоўкі кожнай частцы, каб атрымаць план-сцэнарый.

**Самастойная работа вучняў у групах.**

Кожнай групе даюцца пытанні (на абмеркаванне і падрыхтоўку 3-4 хвіліны).

**I частка**

-Кожны рэжысёр перад тым, як здымаць кінастужку, выбірае месца, фон (малюнкі прыроды). Якім апісаннем прыроды пачынаецца I частка?

Якую ролю адыгрывае гэта апісанне? (*Указвае на час – восеньскі надвячорак – і месца – падворак побач з садком і саламяным хлеўчуком*).

-Апісанне прыроды сустракаецца на працягу твора. Знайдзіце (сярэдзіна II часткі, канец VII часткі) і зачытайце. Яны невялікія, сціслыя. Які настрой выклікаюць? (*Калі прачытаеш замалёўкі, то становіцца зразумела, што размова пойдзе пра сумныя падзеі, цяжкія, пакутлівыя*).

-Толькі гэтым абмежавана роля замалёвак? (*Характар, душэўны стан, настрой гераіні, яе перажыванні*).

-Падбярыце сінонім да слоў апісанне, замалёўка прыроды. (*Пейзаж*). Пераканацца ў сваіх меркаваннях можна, звярнуўшыся да слоўніка лінгвістычных тэрмінаў (с.296).

-А якой вам уяўляецца галоўная гераіня? (*Стомленая, старая жанчына, якая не столькі сячэ дровы, колькі паглядае на дарогу*). Зачытайце радкі пра першую сустрэчу з Тэкляй. Каго чакае Тэкля? Хто заўважыў прыкметы нецярплівасці, хвалявання ў паводзінах жанчыны? Як размаўляе з ёю пісьманосец?

-Аднак мы не можам уявіць сабе вясковую жанчыну без гаспадаркі. Знайдзіце бытавыя дэталі, якія характарызуюць стан гаспадаркі Тэклі. (*Вышчарбленая сякера, незагароджаны двор, закураная печ, два акенцы, у адным з іх чарнела заткнутая шыба, быў кот калісьці, ды і той звёўся*). З якой мэтай аўтар падкрэслівае абыякавасць гераіні да свайго дома? (*Глыбіню гора старой, якая страціла інтарэс да жыцця*).

-Якую назву можна даць першаму пункту нашага плана. (*Туга і надзея старой Тэклі*).

**II частка**

-У II частцы перад намі ізноў добра знаёмы Тэклі пагорак. Раскажыце.

-Знайдзіце і прачытайце радкі, як Тэкля пражыла гэтыя гады.

-Сын Тэклі быў не адзіным, хто не прыйшоў з вайны. Іншыя жанчыны не дачакаліся сыноў і, паплакаўшы, патроху супакойваліся. На чым трымалася вера Тэклі? Чаму толькі яна ўпарта, цярпліва чакала свайго Васілька? (*У спісах загінуўшых і прапаўшых не значыцца. Няма больш адданага чалавека, чым маці*).

-Як маладыя людзі рэагуюць на паводзіны старой?

-Наступіла чарга даць назву II частцы. (*Успамін пра развітанне з сынам*).

**Фізкультхфілінка**

**III частка**

-Чаму іменна ў гэты дзень “заныла” рана старой?

-Першы сынок стаў вялікай уцехай бацькам, - сказана ў тэксце. Якімі эпізодамі з тэксту гэта можна пацвердзіць?

-Раскажыце пра тую размову з маці, якая паказала, што ўжо скончылася дзяцінства яе белагаловага хлопчыка і яе “матчына” ўлада над ім.

-Ізноў праца над часткай завяршаецца загалоўкам. (*Успамін пра дзяцінства Васі*).

**IV частка**

-Раскажыце пра дзівосны сон Тэклі напярэдадні дня нараджэння Васіля. Якое тлумачэнне сама маці дае сну? (*Жывы, пакалечаны, яму патрэбна дапамога*).

-Дайце загаловак гэтай частцы. (*Прарочы сон маці*).

**V частка**

-Калі жанчына не магла ўжо сябе стрымаць? (*Калі развіднела і на гарызонце паказалася адзінокая постаць*).

-Прапануйце, калі ласка, загаловак для гэтай часткі. (*Нясцерпнае жаданне сустрэчы*).

**VI частка**

-З якой мэтай аўтар апісвае эпізадычную сустрэчу з хлопцам на малатарні? (*Хлопец падобны да Васіля*).

-У нейкі момант беспадстаўная вера жанчыны сустрэць сына пачала марнець. Дакажыце радкамі з тэксту.

-Якое жаданне прыйшло на месца спадзяванням і апанавала Тэклю? (*Яна прагла даведацца, дзе пахаваны яе сын*).

-Дайце загаловак гэтай частцы. (*Пакутлівы паход маці*).

**VII частка**

-Як вы разумееце выраз “шчасце не спаткае яе на дарозе”?

-Апошні эпізод сімвалічны – Тэкля стаіць ля помніка і чытае імёны пахаваных байцоў. Ці было ў спісе прозвішча яе сына? Але было там нешта, што асабліва кранула маці. (*Выраз “іншыя”*). Каго аўтар меў на ўвазе пад гэтым словам?

-Чаму, на вашу думку, аўтар пакідае гераіню каля абеліска? (*Гэта памяць і напамінак*).

-Вобраз галоўнай гераіні напісаны псіхалагічна тонка, дакладна. Толькі з мацярынскага сэрца праз 16 год пакутлівага чакання можа вырвацца страшнае пытанне: “Сынок мой, дзе ж ты?”

-Дык у чым выявілася псіхалагічнае майстэрства В.Быкава? Давайце звернемся да лексічнага значэння слова “псіхалагізм”. (*Паглыблены паказ душэўных працэсаў*).

-Каб глыбей раскрыць душэўныя пакуты гераіні, аўтар выкарыстоўвае прыёмы. Якія? Калі неабходна, то звярніцеся да картак-памочнікаў. (*Апісанне быту, бытавыя дэталі, успаміны, сны, пейзаж*).

-Апісваючы перажыванні старой, аўтар выкарыстоўвае азначэнні: *нясцерпная, пакутнае, працяглы, благое, невясёлыя, страшнае*. Да якіх

слоў з тэксту яны адносяцца? (*Чаканне, туга, прадчуванне, боль, думы, пытанне*).

-Наступіла чарга даць загаловак апошняй частцы. (*Страшнае пытанне каля помніка*).

-Прачытайце, які план-сцэнарый атрымаўся. Як відаць з плана, падзеі ў творы разгортваюцца паслядоўна. Ці ведаеце, што такое паслядоўнае разгортванне падзей? Таму, хто сумняваецца, прапаную знайсці адказ на с.67 з падручніка па тэорыі літаратуры.

-Асноўнае дзеянне разгортваецца на працягу сутак, а мы даведваемся амаль пра ўсё жыццё старой Тэклі і яе сям'і. Якім чынам гэта дасягаецца? (*Успаміны*). Улічылі гэта і нашы класныя рэжысёры, калі стваралі кадры кінастужкі.

-Наступная старонка нашай кнігі – "Кінастужка "Незагойная рана""(*дэманстрацыя вучнёўскіх ілюстрацый)*

-У апавяданні няма знешніх эфектаў, прыгодніцкіх, фантастычных элементаў, што звычайна распальваюць чытацкую зацікаўленасць, няма шчаслівай канцоўкі, якая б суцешыла чытача, а непаспешлівае разгортванне падзей, пастаяннае спалучэнне і чаргаванне падрабязнасцей побыту, пейзажу з думкамі, перажываннямі. Тым не менш пісьменнік не адступіў ад праўды жыцця, якой бы горкай яна ні была. Ужо па назве відаць, што апавяданне будзе выклікаць невясёлыя пачуцці, але ж і без іх чалавек не можа абысціся ў жыцці.

-Скажыце, якімі якасцямі павінен валодаць чалавек, каб так напісаць. (*Талентам*). Якія яшчэ якасці павінен мець чалавек, каб стаць пісьменнікам? (*Назіральнасць, дапытлівасць, разумець душу чалавека, бачыць прыгожае, ведаць псіхалогію, разумець прыроду, любіць людзей і інш.*). Напэўна, гэтыя рысы і былі ўласцівы В.Быкаву.

-Ітак, наступная старонка нашай кнігі – "Васіль Быкаў – пісьменнік і чалавек".

-А што вы яшчэ ведаеце пра Васіля Быкава як пісьменніка і чалавека? (*Індывідуальныя паведамленні пра асноўныя і цікавыя этапы жыцця і творчасці пісьменніка*).

-Адкрываем наступную старонку нашай кнігі. Ці пазнаеце вы гэтых людзей? Чым яны праславіліся і вядомы? Раскажыце. (*На дошцы фотаздымкі знакамітых людзей Беларусі, а побач – фотаздымкі вучняў класа з людзьмі розных прафесій і настаўнікам*).

-Як вы думаеце, чаму я побач размясціла вашы фотаздымкі? (*Ад нас залежыць будучыня краіны*).

**5.Дамашняе заданне.**
Пераказаць апавяданне па плане або прыдумаць працяг апавядання.

**6.Выстаўленне адзнак.**

**7.Вынікі ўрока. Рэфлексія.**

-Давайце звернемся да пытання, якое мы паставілі ў пачатку ўрока.

-І якой будзе Беларусь у будучым, залежыць ад вас, нашых дзяцей. Калі вы захочаце стаць рэжысёрамі, то, напэўна, здымеце не адну стужку пра вайну, або напішаце сцэнарый па творах В.Быкава. Можа, пашчасціць нашай школе і хтосьці стане пісьменнікам. А, можа, вы вырасцеце проста нераўнадушнымі людзьмі і разам з удзельнікамі-энтузіястамі клубаў “Пошук” будзеце адшукваць магілы невядомых салдатаў або ўстановіце іх імёны. Але помніце, што вы аўтары і рэжысёры свайго жыцця.

-Гляньце ў акно. Таксама восень. Толькі цёплая, ласкавая. Ціха. Няма сцюдзёнага ветру, раскудлачаных воблакаў. У класе цёпла і ўтульна. Няхай няшчасце, гора, вайна застануцца на старонках апавядання.